**7 (156)**
**ліпень**

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221 ад
8 лютага 2010 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

**НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС**

Заснавальнікі:

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч*

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактары аддзелаў — **Надзея Кушнер, Вітаўт Чаропка**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Галіна Шалюта**.

## ЗМЕСТ

ХР2

ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ

Рыгор Лазько — **Палітыка Савецкай Расіі ў дачыненні да Беларусі ў святле нацыянальнай праграмы партыі бальшавікоў (кастрычнік 1917 г. — пачатак 1919 г.)** 3

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Сяргей Новікаў — **Абарона Магілёва 1941 года: новыя звесткі** 12

ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ

Алена Смірнова — **"Шыкоўны часаслоў герцага Берыйскага" і яго мініяцюры "Поры года"** 17

Юрый Лаўрык — **Заснаванне і дзейнасць манастырскай друкарні ў Куцейне ў XVII ст.** 24

ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ

Мікалай Волкаў — Да пытання аб аўтарстве калекцыі малюнкаў сярэдзіны XVII ст. з архіва князёў Радзівілаў — 34

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

Гелінада Грынчанка, Ірына Раброва, Ірына Раманава — Вусная гісторыя ў постсавецкіх даследчыцкіх практыках Беларусі, Расіі і Украіны — 39

ШКОЛА МАЛАДОГА НАСТАЎНІКА

Аляксандр Корзюк — Славесны метад навучання гісторыі: характарыстыка і прыёмы — 48

МЕТОДЫКА. ТЭОРЫЯ

Таццяна Гвоздзева — Выкарыстанне тэхналогіі "Развіццё крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо" на ўроках гісторыі — 53

Вячаслаў Лазіцкі — Электронны вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі: праблемы, перспектывы яго распрацоўкі і сістэмнага прымянення — 58

МЕТОДЫКА. ВОПЫТ

Людміла Трыгорлава — Фарміраванне ў вучняў матывацыі да вывучэння гісторыі сродкамі пазакласнай работы — 63

Людміла Паўлава — Вялікія геаграфічныя адкрыцці *(VIII клас)* — 67

Сяргей Герасімовіч — Беларусь у вайне 1812 года. *Пазакласнае пазнавальна-выхаваўчае мерапрыемства* — 72

Содержание — 79

Summary — 80


***У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйн***
***па гістарычных і юрі***
***а таксама па маст***
***і культур***


***Адрас рэдакцыі: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1;***
***Тэлефоны: +375-29-569-83-95 (МТС), +375-29-655-67-11 (Velcom).***
**http://aiv.by; e-mail: bhc.redaktor@tut.by.**
**РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**
Падпісана да друку 11.07.2012 г.
Выхад у свет 25.07.2012 г. Афсетны друк.
Фармат 60x84 1/8.
ыд. арк. 11.
ак. 1046.
*і ААТ «Прамдрук».*
*112 ад 11.03.2009 г.*
*ірняхоўскага, 3.*


**За дакладнасць прывед**
**нясуць аўтары. Рэдакцыя мож**
**не падзяляючы пункту гледж**
**да разгляду з рэкамендацы**
**установы. Рэцэнзаванне арган**
**пісы аб'ёмам не больш як 16**
**экзэмплярах (пажадана з ды**
**прозвішча, імя і імя па бацьк**
**(абавязкова асабісты нум**

УВАГА!
ераносы некаторых слоў,
а таксама некаторыя
бaзначэнні на замежных
мовах зроблены не па
правілах граматыкі,
а з улікам магчымасцей
амп'ютарнай настольна-
выдавецкай сістэмы.


**«Беларускі гістарычны часопіс», 2012.**

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Электронны вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі: праблемы, перспектывы яго распрацоўкі і сістэмнага прымянення

*Сістэмнае выкарыстанне электронных сродкаў навучання (ЭСН) рознага тыпу неабходна для актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Значную ролю ў вырашэнні гэтай задачы падчас вывучэння гісторыі Беларусі можа адыграць моцны інфармацыйны адукацыйны рэсурс — электронны вучэбна-метадычны комплекс, які цяпер распрацоўваецца калектывам аўтараў.*

Стварэнне і сістэмнае выкарыстанне электронных вучэбна-метадычных комплексаў (ЭВМК) з'яўляецца актуальным ў адпаведнасці з патрабаваннямі Нацыянальнай праграмы паскоранага развіцця паслуг у сферы інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій на 2011—2015 гады. У 2012 г. пачалі сваю работу творчыя навуковыя калектывы Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца стварэнне ЭВМК па гісторыі і грамадазнаўству, у тым ліку і па гісторыі Беларусі. Таму карысна абагульніць існуючы вопыт распрацоўкі і выкарыстання электронных сродкаў навучання, а таксама тэарэтычна абгрунтаваныя палажэнні, якія павінны ўлічвацца ў працэсе стварэння ЭВМК па гісторыі Беларусі. Гэта дазволіць мінімізаваць ці ўвогуле пазбегнуць сістэмных памылак падчас распрацоўкі і прымянення электронных сродкаў навучання (ЭСН) як кампанентаў, з якіх будзе складацца ЭВМК.

Увага распрацоўшчыкаў ЭВМК і іх кампанентаў, пад якімі мы разумеем рознатыповыя электронныя сродкі навучання, часцей за ўсё акцэнтуецца на структурнай пабудове мадэлюемых сістэм. Пры гэтым часам належным чынам не разглядаецца праблема інтэграцыі кампанентаў ЭВМК ў працэс навучання. Таксама па-за ўвагай аўтарскіх калектываў застаецца разгляд пытання аб дыдактычнай ролі ЭСН і крытэрыях, па якіх павінна вызначацца іх структура і змястоўнае напаўненне.

Аналіз практыкі стварэння і выкарыстання электронных сродкаў навучання па гісторыі Беларусі дазваляе рабіць высновы аб несістэмным і эмпірычным узроўнях іх распрацаванасці і выкарыстан-



*ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч.*
*Выконваючы абавязкі загадчыка кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. З 1989 г. па 2009 г. працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 Пінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Выкарыстанне электронных сродкаў навучання падчас вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі". Займаецца даследаваннем укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання. Аўтар больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфіі "Навукова-метадычныя асновы выкарыстання ЭСН па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах (на прыкладзе гісторыі)" (Мн., 2009).*

ня ў школе. У пэўнай ступені гэта абумоўлена недастатковым валоданнем настаўнікамі тэарэтычнымі напрацоўкамі ў дадзенай сферы. Фрагментарнае выкарыстанне настаўнікамі ЭСН падчас выкладання гісторыі Беларусі можна патлумачыць разуменнем іх дыдактычнай ролі выключна як эфектнага сродку прэзентацыі зместу вучэбнага матэрыялу ці дыягностыкі ведаў вучняў з дапамогай тэстаў. Такім чынам, пры вывучэнні гісторыі Беларусі відавочна значнае абмежаванне тэхналагічнага і дыдактычнага патэнцыялу ЭСН у межах прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Пераадоленне азначаных праблем можна разгледзець на прыкладзе распрацоўкі і прымянення такога папулярнага электроннага сродку навучання як *мультымедыйная прэзентацыя.*

Неабходна адзначыць, што ў сваёй большасці самастойна створаныя настаўнікамі мультымедыйныя прэзентацыі выступаюць у якасці тлумачальна-ілюстрацыйнага кампанента навучання або прымяняюцца на ўроку толькі як дэманстрацыйнае суправаджэнне. Часцей за ўсё яны не адаптаваны да творчых і праблемна-пошукавых метадаў навучання (за выключэннем метаду праектаў), арыентаваны на аднаўленне пэўных аб'ёмаў вучэбнай інфармацыі без адпрацоўкі ўменняў яе аналізаваць і сістэматызаваць. Найбольш распаўсюджанымі памылкамі ў распрацоўцы і прымяненні мультымедыйных прэзентацый з'яўляюцца наступныя:

— фрагментарнае і несістэмнае прымяненне;

— памылкі ў афармленні (суаднясенне фона, ілюстрацыйнага матэрыялу, тыпа і памеру шрыфта);

— перабольшванне аб'ёму вучэбнай інфармацыі, якая прадстаўляецца вучням да засваення;

— дубліраванне інфармацыі вучэбнага дапаможніка і невыкарыстанне дыдактычных магчымасцей ЭСН у сукупнасці з традыцыйнымі сродкамі навучання;

— адсутнасць пастаноўкі праблемы пры падачы вучэбнага гістарычнага матэрыялу;

— невыкарыстанне ўсёй паўнаты тэхналагічнага патэнцыялу мультымедыйнай прэзентацыі, што даволі часта тлумачыцца няведаннем настаўнікам-распрацоўшчыкам магчымасцей дадзенага віду ЭСН.

Пераадоленне падобных недахопаў магчыма праз выкарыстанне канкрэтных метадычных прыёмаў. Напрыклад, падчас правядзення ўводнага занятку па гісторыі Беларусі ў 6 класе на этапе ўваходзячага кантролю з мэтай дыягностыкі ведаў і уменняў вучняў прапануецца шэраг заданняў з выкарыстаннем экраннай формы прадстаўлення вучэбнага матэрыялу *(гл. малюнак 1)*. Выкарыстанне "стужкі часу" (з ёй вучні знаёмяцца ў 5 класе пры вывучэнні гісторыі Старажытнага свету) спрыяе праверцы ведаў і ўменняў вучняў па гістарычнай храналогіі.




*Малюнак 1. Экранная форма прадстаўлення храналагічнага кампанента зместу вучэбнага матэрыялу пры актуалізацыі раней засвоеных ведаў.*

На этапе прадстаўлення і засваення вучэбнага матэрыялу можна выкарыстоўваць такія экранныя формы, выкананыя ў колеры, якія дазваляць выкарыстаць праблемны падыход у працэсе навучання *(гл. малюнкі 2—4)*.




*Малюнак 2. Экранная форма прадстаўлення картаграфічнага кампанента вучэбнага матэрыялу пры яго праблематызацыі.*




*Малюнак 3. Экранная форма прадстаўлення тэарэтычнага і факталагічнага кампанентаў зместу вучэбнага матэрыялу пры яго праблематызацыі.*




*Малюнак 4. Экранная форма прадстаўлення тэарэтычнага кампанента зместу вучэбнага матэрыялу пры яго візуалізацыі і асэнсаванні.*

Практыка стварэння і выкарыстання мультымедыйных прэзентацый па гісторыі Беларусі сведчыць аб пераваze ў іх змястоўным напаўненні фактапагічнага кампанента без патрэбнага суаднясення яго з тэарэтычным. Прэзентацыі часцей за ўсё выкарыстоўваюцца без уліку мэтазгоднасці іх інтэграцыі ў працэс навучання з улікам комплекснага прымянення разам з электроннымі слоўнікамі, хрэстаматыямі, аніміраванымі гістарычнымі картамі і інш. Неабходна адзначыць, што нават знаёмства з гістарычнымі тэрмінамі як элементамі навучання патрабуе пабудовы дыдактычнай сувязі: тэрмін — азначэнне тэрміна — графічны вобраз. Так, падчас вывучэння на ўроку гісторыі Беларусі тэрмінаў "кераміка", "вытворчасць керамікі" з дапамогай слайда прэзентацыі мы можам пакрокава з улікам тэхналагічных магчымасцей дадзенага ЭСН вывесці сам тэрмін, яго азначэнне, графічны вобраз *(гл. малюнак 5)*.




*Малюнак 5. Экранная форма прадстаўлення тэарэтычнага кампанента зместу вучэбнага матэрыялу пры яго візуалізацыі і асэнсаванні.*

Паспяховае выкарыстанне ЭСН разам з традыцыйнымі кампанентамі вучэбна-метадычнага комплексу пры навучанні гісторыі Беларусі дазволіць пазбегнуць вялікай колькасці памылак і выйсці на якасна новы ўзровень арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Для гэтага неабходна ўлічыць важныя тэарэтычныя і практыкаарыентаваныя палажэнні:

— дыдактычны падыход у разуменні сутнасці ЭВМК па гісторыі Беларусі павінен улічваць тэхналагічныя і дыдактычныя характарыстыкі яго кампанентаў і быць абумоўлены асаблівасцямі працэсу гістарычнага пазнання, спецыфікай навучання гісторыі Беларусі на другой і трэцяй ступенях агульнай сярэдняй адукацыі;

— метадычныя ўмовы і прынцыпы стварэння і сістэмнага прымянення ЭВМК з улікам дыдактычнай ролі, якую яны выконваюць;

— змястоўнае напаўненне электронных кампанентаў ЭВМК па гісторыі Беларусі з улікам асноўных палажэнняў Адукацыйнага стандарта, вучэбнага прадмета "Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі", спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Пры гэтым, да асноўных палажэнняў, якія вызначаюць змястоўнае напаўненне і структуру ЭВМК па гісторыі Беларусі, неабходна аднесці наступныя:

— гістарычны час (суаднясенне гістарычнага факта з пэўным часам; вызначэнне храналагічнай паслядоўнасці і працягласці гістарычных падзей, з'яў і працэсаў; адлюстраванне іх сінхроннасці; перыядызацыя гісторыі);

— гістарычная адлегласць (лакалізацыя гістарычных падзей па месцы дзеяння; вызначэнне лакальнасці і глабальнасці гістарычных працэсаў);

— гістарычнае развіццё (вызначаецца ў наступных аспектах: антрапалагічным, псіхалагічным, культуралагічным, этнанацыянальным, дзяржаўна-палітычным, геапалітычным, сацыяльным, філасофскім, аксіялагічным).

Для вырашэння задачы вызначэння зместу і структуры ЭВМК па гісторыі Беларусі неабходна вылучыць наступныя кампаненты, якія ён павінен змяшчаць:

— тэарэтычныя (паняцці рознай ступені абагульнення, сутнасныя прычынна-выніковыя сувязі, заканамернасці развіцця, тэарэтычныя вывады);

— факталагічныя (інфармацыя пра канкрэтныя падзеі, лакалізаваныя ў часе і прасторы, якія павінны быць суаднесены з храналагічнымі і картаграфічнымі кампанентамі);

— метадалагічныя (інфармацыя аб метадах, працэсе пазнання гісторыі, пра канкрэтныя метады навукі і розныя спосабы дзейнасці);

— ацэначныя (азнаямленне з рознымі пунктамі гледжання на гістарычныя падзеі).

Дадзеныя кампаненты, а таксама ўлік тэхналагічных і дыдактычных асаблівасцей ЭВМК па гісторыі Беларусі дазваляюць вызначыць іх дыдактычную ролю ў адукацыйным працэсе, а таксама канкрэтызаваць само паняцце электронны вучэбна-метадычны комплекс.

*Якім жа ўяўляецца электронны вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі?* На наш погляд, ЭВМК па гісторыі Беларусі павінен быць моцным інфармацыйным адукацыйным рэсурсам і прызначацца для эфектыўнага дыдактычнага забеспячэння арганізацыі і ажыццяўлення працэсу навучання. Іншымі словамі, гэта праграмны прадукт вучэбнага прызначэння, які забяспечвае непарыўнасць і паўнату дыдактычнага цыкла працэсу навучання, змяшчае арганізацыйныя і сістэматызаваныя нарматыўныя, тэарэтычныя, практычныя, кантралюючыя матэрыялы, аптымізаваныя ў дачыненні да навукова-метадычных распрацаваных палажэнняў па іх стварэнні і сістэмным прымяненні.

ЭВМК па гісторыі Беларусі павінен будавацца па модульным прынцыпе. Пад модулем ЭВМК мы разумеем структурную частку інфармацыйнага рэсурса, адносна самастойную арганізацыйна-змястоўную адзінку сістэмы навучання, якая выконвае сваю канкрэтную дыдактычную ролю. Прыкметамі модуля з'яўляюцца: цэласнасць, адносная незалежнасць і лагічная завершанасць зместу, гібкасць структуры, аператыўнасць кантролю і ацэньвання вынікаў навучання падчас вызначэння актыўнай зваротнай сувязі суб'ектаў дадзенага працэсу (настаўніка і вучня). Пры гэтым асноўны модуль можа ўключаць некалькі модульных адзінак, кожная з якіх можа складацца з канкрэтных вучэбных элементаў. Вучэбным элементам у модулі можа быць частка вучэбнага матэрыялу, якая адлюстроўвае вызначаны змястоўны і функцыянальны аспект модульнай адзінкі (напрыклад, вучэбным элементам з'яўляецца паняцце і яго тлумачэнне ў электронным слоўніку-гласарыі як модульнай адзінцы ЭВМК).

З пункту гледжання дыдактыкі модульная пабудова ЭВМК па гісторыі Беларусі дазваляе пазбегнуць жорсткага навязвання той ці іншай стратэгіі вучэбнага занятку. Яе гнуткасць і магчымасць для настаўніка ствараць уласную мадэль урока з'яўляюцца важнай метадычнай умовай прымянення электронных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу. Дыдактычная роля ЭВМК заключаецца ў кіраванні працэсам засваення вучнямі вучэбных гістарычных ведаў, а таксама прадукцыйнымі спосабамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці пры яе алгарытмізацыі — паслядоўнай і пакрокавай. ЭВМК дазваляе настаўніку ажыццявіць адбор неабходных для пабудовы ўрока і арганізацыі паспяховай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў элементаў.

У адпаведнасці з модульным прынцыпам ЭВМК па гісторыі Беларусі падзяляецца на наступныя модулі (раздзелы): нарматыўны, тэарэтычны, даведачна-інфармацыйны, кантрольна-дыягнастычны. Пры іх стварэнні неабходна ўлічваць спецыфіку, дыдактычную накіраванасць і функцыянальнасць кожнай з модульных адзінак. Гнуткасць структуры і зместу ЭВМК па гісторыі Беларусі дыктуецца ўлікам магчымасці змянення структуры і зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу, у адпаведнасці з Адукацыйным стандартам і праграмна-метадычнай дакументацыяй.

*Нарматыўны модуль ЭВМК* змяшчае ў сабе дакументацыю, якая вызначае змест і арганізацыю агульнай сярэдняй адукацыі ў прадметнай галіне "Гісторыя": Адукацыйны стандарт па гісторыі, вучэбныя праграмы і іншыя праграмна-плануючыя і вучэбна-метадычныя дакументы, пералік вучэбных выданняў, якія рэкамендуюцца для вывучэння гісторыі.

У *тэарэтычны модуль* уваходзяць электронныя матэрыялы (электронны тэкст, прэзентацыі, лекцыйны матэрыял і інш.), якія забяспечваюць тэарэтычнае вывучэнне гісторыі Беларусі.

*Даведачна-інфармацыйны модуль* складаецца з модульных адзінак, якія забяспечваюць арганізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Настаўнік (ці вучань у працэсе самаадукацыі) можа выкарыстоўваць іх для інфармацыйнай падтрымкі працэсу навучання. У якасці модульных адзінак даведачна-інфармацыйнага модуля ЭВМК па гісторыі Беларусі ў мінімальна неабходным камплектаванні мэтазгодна вызначыць наступныя:

— слоўнік (змяшчае галоўным чынам тэарэтычныя веды па гісторыі — азначэнні гістарычных тэрмінаў і паняццяў рознай ступені абагульнення);

— храналагічны даведнік змяшчае матэрыялы па лакалізацыі гістарычных падзей у часе);

— даведнік па гістарычных персаналіях (партрэтныя выявы і біяграфіі гістарычных дзеячаў);

— гістарычныя карты і картасхемы (картаграфічны матэрыял прадстаўлены ў дынамічнай анімацыйнай форме);

— хрэстаматыю (гістарычныя дакументы ў электронным выглядзе).

Важнай асаблівасцю тэхналагічнага афармлення тэксту кожнай модульнай адзінкі з'яўляецца прадстаўленне гістарычнага матэрыялу праз гіперпасылкі, якія дазваляюць больш аператыўна ажыццяўляць пошук неабходнай інфармацыі.

*Кантрольна-дыягнастычны модуль* складаецца з матэрыялаў, якія дазволяць ажыццяўляць дыягностыку і кантроль вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Пры стварэнні дыягнастычнага інструментарыя (тэставых заданняў і комплексаў) неабходна ўлічваць абавязковую ўмову яго аптымізацыі адпаведна дзесяцібальнай сістэме

ацэнкі ўзроўняў засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу. Такім чынам, тып, від і форма кожнага тэставага задання павінны жорстка адпавядаць узроўням засваення вучэбнага матэрыялу.

Пераадоленне недахопаў пры выкарыстанні ЭСН па гісторыі Беларусі магчыма толькі з улікам выканання шэрага арганізацыйных і метадычных умоў:

— навуковасць зместу і забеспячэнне арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на навуковых прынцыпах;

— выкананне ЭСН дыдактычнай ролі па кіраванню працэсам засваення зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу пры камп'ютарнай падтрымцы традыцыйных кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу на ўсіх этапах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

— пераадоленне фрагментарнага характару прадстаўлення зместу вучэбнага матэрыялу па гісторыі Беларусі праз яго структурыраванне па модульным прынцыпе і адпаведна кампанентам вучэбных гістарычных ведаў;

— забеспячэнне вучня пастаяннай інфармацыяй аб бліжэйшых і аддаленых мэтах навучання, а таксама ступенях іх дасягнення на кожным этапе навучання;

— улік высокай матывацыі вучняў да навучання з дапамогай інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій і камп'ютараў;

— забеспячэнне праблемна-тэарэтычнага ўзроўню вывучэння гісторыі Беларусі;

— рэалізацыя дзейнаснага кампанента прадметнага навучання, арыентаванага на фарміраванне ў вучняў уменняў працаваць з храналагічным, картаграфічным матэрыялам, а таксама гістарычнымі крыніцамі з дапамогай ЭВМК;

— забеспячэнне эфектыўнасці ў рэалізацыі кантрольна-ацэначнай і карэктуючай функцый;

— забеспячэнне індывідуалізацыі навучання і магчымасці вызначэння вучнем індывідуальнай сістэмы навучання ў межах зададзенага механізму алгарытмізацыі вучэбных дзеянняў;

— наяўнасць інфармацыйнай кампетэнцыі настаўніка, а таксама неабходных ведаў, уменняў і навыкаў вучняў па карыстанню камп'ютарам і электроннымі сродкамі навучання ў рамках інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, якія выкарыстоўваюцца;

— наяўнасць камфортнага дызайнерскага афармлення інфармацыйнага адукацыйнага рэсурсу.

Відавочна, што навукова-метадычнае забеспячэнне працэсаў інфарматызацыі і камп'ютарызацыі адукацыйнай сферы, распрацоўка і сістэмнае прымяненне электронных вучэбна-метадычных комплексаў уяўляецца актуальнай і перспектыўнай задачай. Узровень распрацаванасці педагагічнай тэорыі і практыкі стварэння традыцыйных кампанентаў прадметных вучэбна-метадычных комплексаў дазваляе ў сучасных умовах развіцця працэсаў інфарматызацыі і камп'ютарызацыі адукацыі ўлічваць спецыфіку распрацоўкі ЭВМК па гісторыі Беларусі. Стварэнне ЭВМК па гісторыі Беларусі дазволіць ажыццявіць эфектыўнае кіраванне вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю вучняў, актыўна стымуляваць рацыянальнае суаднясенне розных яе відаў у залежнасці ад прадукцыйнасці засваення вучэбнага гістарычнага матэрыялу, а таксама як агульнавучэбных, так і спецыяльных прадметных спосабаў вучэбнай дзейнасці.

Прагназуемая эфектыўнасць магчыма пры наяўнасці не толькі якаснага інфармацыйнага адукацыйнага рэсурсу, але і з улікам неабходных арганізацыйных і метадычных умоў сістэмнага выкарыстання электронных сродкаў навучання — *кампанентаў ЭВМК па гісторыі Беларусі.*

## Літаратура


Бабанский Ю.К. Дидактические проблемы совершенствования учебных комплексов // Проблемы школьного учебника. М., 1980. Вып. 8. С. 17—33.

Беспалько В.П. Образование и обучение с участием компьютеров (педагогика третьего тысячелетия). М.; Воронеж, 2002.

Дмитриев Е.И. Методические особенности проектирования и разработки УМК профильного типа // Кіраванне ў адукацыі. 2006, № 6. С. 27—34.

Инструктивно-методическое письмо по использованию информационно-коммуникационных технологий и электронных средств обучения в образовательном процессе [Электронный ресурс]. 2011. Режим доступа : http://adu.by/modules.php?name=News&new_topic=212. Дата доступа : 03.06.2012.

Краснова М.А. Теоретические основания разработки учебно-методического комплекса нового поколения по истории и обществоведению для системы общего среднего образования // Образование и педагогическая наука: сб. науч. ст. Вып. 1. Сер. 2. Мн., 2008. С. 153—166.

Национальная программа ускоренного развития услуг в сфере информационно-коммуникационных технологий на 2011—2015 годы : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 28 марта 2011 г., № 384 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. 2011. № 38. 5/33546.

Пальчевский Б.В. Учебно-методический комплекс средств обучения // Советская педагогика. 1991, № 6. С. 24—29.

Положение об учебно-методическом комплексе для учреждений, обеспечивающих получение общего среднего образования (утверждено Министерством образования Республики Беларусь 7.10.2004 г.) [Электронный ресурс]. 2004. Режим доступа : http://www.ripo.unibel.by/oso/files/ post710.rar. Дата доступа: 03.07.2007.